ПРАЕКТЫ

# КАЛЯРОВЫ ТЫДЗЕНЬ

Напярэдадні самых доўгіх школьных канікул у СШ № 19 г. Гродна ажыццяўляецца незвычайны праект “Каляровы тыдзень” для вучняў пачатковых класаў. Напрыклад, Зялёнаму колеру адпавядае “Дзень роднай мовы і малой Радзімы”, Сінім будзе азначацца “Дзень матэматыкі”, Чырвоны колер сімвалізуе “Дзень карысных звычак”, Жоўты – “Дзень літаратурнага чытання і творчасці” і апошні – “Дзень строгага стылю” – “У касцюме да поспеху”.

Дамоўлена, што кожнаму каляроваму дню вопратка павінна адпавядаць колерам ці мець аксэсуары такога колеру.

Распачаў тыдзень “Зялёны Дзень роднай мовы і малой Радзімы” 26 мая 2025 года. У 2 “Б” класе прайшоў урок на тэму “Сяброўка – Родная мова”. Настаўніца Людміла Іосіфаўна Ярмак запрасіла на ўрок сапраўдную сяброўку роднай мовы – гродзенскую дзіцячую пісьменніцу Ганну Іосіфаўну Скаржынскую-Савіцкую.

Сустрэчу Ганна Іосіфаўна распачала таксама незвычайна. Яна знаёміла вучняў не са сваімі кнігамі, а з цікавымі беларускімі часопісамі для дзяцей на роднай мове “Вясёлкай”, “Бусяй” і “Рукзачком”. Пачытала сваю казку “Лепш 100 сяброў, чым 100 рублёў” і апавяданне “Сумленная дзяўчынка” з “Вясёлкі”. Дарэчы, за гэтае апавяданне пісьменніца атрымала 2-е месца ў конкурсе “Кніга – мне, кніга ўва мне” за 2024 год.

У другім нумары часопіса “Буся” стартавала казка “Мішка-выхвалішка” з цыклу казак “Пра мядзведзіка Мішку”. Ганна Іосіфаўна прачытала ўрывак з гэтай казкі. Вучням вельмі спадабаліся ілюстраваныя героі казкі: мядзведзік Мішка і ваверачка Пуся. Пісьменніца параіла дзецям выпісаць “Бусю”, каб сабраць усе казкі пра Мішку. Заінтрыгавала вучняў да чытання часопіса.

Затым дзеці рашалі крыжаванку па творчасці пісьменніцы. Адгадвалі загадкі. Ганна Іосіфаўна падзялілася, над чым працуе цяпер. Адказала на пытанні.

Урок прайшоў цікава і захапляльна. Спадзяёмся, што зялёны колер, а гэта колер гармоніі з прыродай і цішыні, будзе гарманіраваць і з роднай мовай, на якой мы павінны размаўляць не толькі ў прызначаны для яе дзень, але і кожную хвіліну. Менавіта гэтага пажадала пісьменніца вучням.

**САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ**
**Гродзенскае абласное аддзяленне**

**На фота:** падчас рэалізацыі праекта “Каляровы тыдзень” з удзелам члена Саюза пісьменнікаў Беларусі, вядомай дзіцячай пісьменніцы Ганны Скаржынскай-Савіцкай. СШ № 19 г. Гродна, май 2025 года.



*Урок "Сяброўка – Родная мова" ў 2 "Б" класе СШ № 19 г. Гродна праводзіць настаўніца Людміла Іосіфаўна Ярмак*



***Францыск Скарына – першадрукар…***




***Гучы, родная мова!***




***Часопіс "Буся"– скарбонка твораў на роднай мове***



***Часопіс “Вясёлка”– лепшае выданне для дзяцей***



***Рашаем крыжаванку***







***Рашаем крыжаванку па творчасці Г. І. Скаржынскай-Савіцкай***






***Ведаю слова… дацягнуся… напішу...***



***Перакладваем словы з рускай мовы на беларускую***




***Будзем чытаць цікавыя беларускія часопісы…***




***Вучні 2 "Б" кл. з пісьменніцай Ганнай Іосіфаўнай і настаўніцай Людмілай Іосіфаўнай***